7. Булгарин, Ф. В. Юридические соображения о единственном средстве к пресечению бесконечных процессов в России // Видок Фиглярин: письма и агентурные записки Ф. В. Булгарина в III отделение; публ., сост., предисл. и коммент. А. И. Рейтблата. — М. : НЛО, 1998. — С. 99–101.

## Сябры і госці М. К. Агінскага ў Залессі

*Гайко Г. С., студ. IV к. ГрДУ ім. Я. Купалы,*
*навук. кір. праф. Марозава С. В., д-р гіст. навук*

Сёння Залессе — гэта аграгарадок з насельніцтвам, прыкладна, каля тысячы чалавек у Смаргонскім райне Гродзенскай вобласці. Колішняя сядзіба княжацкага роду Агінскіх, Залессе ў той час, калі тут пасяліўся і жыў М. К. Агінскі (1802–1822), стала культурна-асветным цэнтрам усяго краю. Ад сучаснікаў сядзіба М. К. Агінскага атрымала ўзвышаную назву — «Паўночныя Афіны». Такі культурны «статус» Залесся, гасціннасць яго гаспадароў, а таксама ўдалае размяшчэнне маёнтка каля паштовых дарог Пецярбург – Варшава і Вільня – Мінск спрыялі пастаяннаму наплыву гасцей. Многія вядомыя айчынныя і замежныя, палітычныя і культурныя дзеячы спыняліся тут адпачыць. А вядомы беларуска-польскі паэт А. Ходзька нават прысвяціў Залессю адну са сваіх паэм Пагасцяваць сюды часта прыязджалі прафесары Віленскага ўніверсітэта, ганаровым членам якога М. К. Агінскі з’яўляўся дзякуючы сваёй актыўнай мецэнацкай дзейнасці [6, с. 12].

У 1811 г. з Парыжа разам з М. К. Агінскім у Залессе прыехаў італьянскі музыкант і кампазітар Джузэпе Паліяні, які жыў тут на працягу адзінаццаці гадоў і выкладаў музыку дзецям гаспадара «Паўночных Афін». Д. Паліяні нарадзіўся ў Рыме ў 1781 г., жыў у Неапалі, Парыжы, быў вядомы ў Еўропе як кампазітар — складаў вакальныя і інструментальныя творы — і выканаўца [2, с. 82].

У 1819 г. М. К. Агінскі ўзяў да сябе на службу сакратаром 19-гадовага Леанарда Ходзьку, які незадоўга да таго закончыў Віленскі ўніверсітэт і быў удзельнікам таварыства філарэтаў, дзе зблізіўся з А. Міцкевічам, Я. Чачотам, Т. Занам. Л. Ходзька зрабіў малюнкі Залесся. З ім М. К. Агінскі ездзіў у Кіеў, Санкт-Пецярбург. Юнак дапамагаў князю ў Залессі весці карэспандэнцыю, а пазней — у працы над «Мемуарамі».

У 1822 г. Л. Ходзька разам з М. К. Агінскім падаўся ў эміграцыю, з 1826 г. жыў у Парыжы. Ён вядомы таксама як выдавец зборніка твораў А. Міцкевіча і І. Красінскага, мемуараў М. К. Агінскага, як аўтар біяграфіі Т. Касцюшкі і працы «Папулярная гісторыя Польшчы».

У ліпені 1822 г. Залессе наведаў студэнт Віленскага ўніверсітэта, 19-гадовы Аляксандр Ходзька, сваяк Леанарда Ходзькі [5]. Гуляючы па сядзібе і

парку, Алякасандр быў так ўражаны іх прыгажосцю, што за некалькі гадзін, склаў паэму «Залессе». Вось радкі з яе:

«З вышыняў **праўнукам** даслаў бы я Залессе,
Ды, адчуваючы у грудзях духоўнага агню ўздымы,
Сюды! склікаў бы мастакоў, сюды! паэт, бяжымы…» [7, с.192].

У сядзібе М. К. Агінскага ў 1822 г. гасцяваў яго былы настаўнік музыкі Восіп Казлоўскі, які лічыцца класікам рускай музыкі даглінкаўскай пары, стваральнікам героіка-драматычнага і лірыка-псіхалагічнага кірунку ў сімфанічнай музыцы. Яго творчасць, знітавана з культурамі Беларусі, Польшчы і Расіі, з'яўляецца яркім і дасканалым узорам мастацтва пераходнага перыяду, што падрыхтавала наступленне рамантычнай эпохі.

У Залессі да М. К. Агінскага і В. Казлоўскага далучалася яшчэ некалькі музыкантаў, і ў сядзібе наладжваліся сапраўдныя музычныя святы. Італьянскія песні гучалі ў выкананні спевака Джузэпе Паліяні [4, с. 210].

Госці князя, пасля вандровак на конях ці брычках да Віліі, збіраліся ў адной з гасцёўняў палаца, дзе ладзіліся музычныя вечарыны. Гучаў квартэт, дзе першую скрыпку граў сам князь Міхал, другую — вядомы ў той час ў Вільні музыка, іспанец Р. Эскудэра, на віяланчэлі граў В. Казлоўскі, на фартэпіяна —Амелія Агінская, яна ў той час ужо складала паланэзы, добра малявала і захаплялася паэзіяй. Настаўнік музыкі дачок князя — Д. Паліяні спяваў па-італьянску арыі ці рэчытацівы з опер, пад акампанемент фартэпіяна [2, с. 82].

Сярод гасцей князя быў былы паўстанец, афіцэр Паўловіч, які выратаваў Агінскага падчас бою з расійскім войскам у 1794 г. пад Вішневым [2, с. 83].

Да 1806 г. М. К. Агінскі амаль бязвыездна жыў у Залессі, займаючыся наладжваннем сядзібы, творчасцю, прыёмам гасцей. Пасля вяртання ў 1802 г. з эміграцыі ён намерваўся цалкам адысці ад палітычных спраў, бо не існавала ўжо дзяржавы, служэнню якой ён быў гатовы прысвяціць сябе. Але ў 1806 г. яго зноў зацягнула ў вір палітыкі.

## Літаратура


1. Podlaska Biblioteka Cyfrowa [Elektronowy zasób]. / Pamiętnik Gabrjeli z Guntherów Puzyniny: W Wilnie i w dworach Litewskich. — Wilno : 1928. — Reżim dostępu : http://pbc.biaman.pl/dlibra/. — Data dostępu : 23.02.2016.
2. Верамейчык, С. Міхал Клеафас Агінскі, 1765–1833: продкі, жыццё ў Залессі, нашчадкі: (спроба храналогіі) / С. Верамейчык. — Мінск : Кавалер Паблішэрс, 2003. — 127 с.
3. Кляшчонак, Т. М. К. Агінскі і Беларусь / Т. М. Кляшчонак // Беларускі гістарычны часопіс. — 2000. — № 2. — С. 79–90.
4. Ліс, А. Агінскі ў Залессі. Песню ў спадчыну / А. Ліс. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. — 295 с.

5. Самусік, А. «Северные Афины» Огинских / А. Самусік // Залеская талака [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http://zalesse.by/2011/09/11/severnyie-afinyi-oginskih/. — Дата доступа : 02.03 2016.
6. Трэпет, Л. В. Там, дзе гучалі паланэзы / Л. В. Трэпет. — Мінск : «Полымя». — 1990. — 34 с.
7. Ходзька, Л. Залессе / Л. Ходзька // Спадчына. — 1997. — № 3. — С. 192–199.

# Теоретические концепции выборной монархии и императорской власти в Священной Римской империи в XII — первой половине XIV вв.

*Гордейчук С. С., магистрант БГУ,*
*науч. рук. Смирнова Е. Д., канд. ист. наук, доц.*

В Священной Римской империи в Высокое и Позднее Средневековье существовали оригинальные концепция монархии, которые признавали незыблемым принцип выборности монархии и придавали решающее значение в выборе римских королей роли князей империи. Одним из первых ее изложил в XII в. неизвестный немецкий хронист в сообщении об избрании в 1152 г. Фридриха I Гогенштауфена во Франкфурте-на-Майне римским королем: «Во Франкфурте 4 марта, во вторник, совместной властью князей и некоторых баронов из Италии было объединено тело империи (т. е. состоялись выборы римского короля. — **С. Г.**). Это право, которое передает королевство не по кровнородственной линии, а обеспечивает избрание королей князьями, является особенностью Римской империи» [4, S. 152]. Кельнский каноник Александр фон Роэс в период «Великого междуцарствия» (1254–1273) дал следующее теоретическое обоснование выборному характеру немецкой монархии: «Известно, что Божественным провидением святой император Карл Великий, с согласия и при участии папы, определил и установил, что Римская империя навеки будет основываться на правомочном избрании [римского короля] немецкими князьями. Это не означает, что Божья святость, власть над христианами будут случайно переданы кому-либо в соответствии с правом наследования» [4, S. 152]. Данные теории подчеркивали и защищали ссылками на Божественное провидение и согласие понтификов на элитарный, олигархический характер избрания королей Германии, коронованных позднее папами императорской короной, который обеспечивал приход к власти наиболее «достойных» лиц из узкого круга знати.

В первой половине XIV в., в период борьбы императора Людвига IV Виттельсбаха (1314–1347) с папским Римом, М. Майнардини (Падуанский) и